# Этнафіласофія і праблема працы з жывой традыцыяй



Канструяванне сэнсаў. Традыцыйны беларускі павук як структура свету. Ілюстрацыя Максіма Храпавіцкага да кнігі «Традыцыйны светалад беларусаў. Касмалогія». Мінск, 2023 г.

**Ірына Дубянецкая,**
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі, доктар тэалогіі

У Беларусі склалася вялікая школа даследаванняў народнай традыцыі, як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай. Фальклярыстычныя і этнаграфічныя запісы, шматлікія выданні, у тым ліку і акадэмічныя, зробленыя за апошнія два стагоддзі, дэманструюць не толькі багацце і распрацаванасць культуры беларускага традыцыйнага грамадства, не толькі надзвычайную для Еўропы жанравую і сюжэтную разнастайнасць нацыянальнага фальклору, але і высокую якасць, глыбіню і выкшталцонасць навуковых штудыяў. Гэта ўсё – і велізарны аб'ём матэрыялу, і яго навуковая прадстаўленасць – стала базаю для новага вітка ў вывучэнні і асэнсаванні беларускіх звычаяў, пачатак якому паклаў праект этнафіласофскіх даследаванняў, што стартаваў у Інстытуце філасофіі ў 2019 г.

Айчынная этнафіласофія працуе з традыцыйнай культурай як цэласнай сістэмай уяўленняў, ведаў, практык і каштоўнасцей. Гэта погляд на яе як на адзіную комплексную з'яву, якая фарміравалася, жыла, мянялася, адаптоўвалася да новых эпох і сама адаптоўвала гэтыя эпохі, з'яву, дзе ўсе самыя рознапланавыя і нават нібыта артаганальныя кампаненты, сферы і пласты непарыўна, глыбінна звязаныя паміж сабой, дапаўняюць, ускладняюць і абумоўліваюць адно аднога.

Этнафіласофія працуе ў некалькіх кірунках. Гэта найперш спроба рэканструкцыі шматмернай народнай карціны свету ў яе анталагічнай, сацыяльнай, антрапалагічнай, эпістэмалагічнай, аксіялагічнай ды іншых праекцыях. Наступная задача – навуковае асэнсаванне і інтэрпрэтацыя акумуляванага матэрыялу. Працуючы з мастацтвам народа, яго песнямі, звычаямі, нормамі паводзін і адносін, каштоўнасцямі, уяўленнямі пра сусвет, чалавека і сферу сакральнага, этнафіласофія ўзнаўляе светамысленне традыцыйнай супольнасці, найперш у яе інтэлектуальным аспекце – канцэптуалізацыі і катэгарызацыі рэчаіснасці, яе элементаў і ўнутраных сувязей. Гэта спроба зразумець і сфар-

муляваць, што ўяўляе сабой карціна свету, чаму яна такая, як яна звязаная з аналагічнымі напрацоўкамі ў іншых традыцыйных сістэмах, сучасных ёй і папярэдніх, звязаных і не звязаных этналінгвістычнай роднасцю, што мае з імі агульнага і што ў ёй унікальнае – так бы мовіць, тэкст самой традыцыі ўбачыць і ацаніць у бліжнім і дальнім часава-прасторавым кантэксце.

Яшчэ адзін, магчыма асноўны, напрамак працы этнафіласофіі, які адрознівае яе ад іншых даследаванняў народнай традыцыі, мае на мэце прасачыць, як адбываюцца самыя працэсы светамыслення і як у іх нетрах утвараюцца сэнсы, як фарміруюцца канцэпты, а таксама (і гэта яшчэ адзін запыт гэтай навукі) тое, як яны становяцца культурнымі кодамі нацыі – тымі прасеянымі праз сіта часу сімваламі, устойлівымі вобразамі і паняткамі, якія так ці інакш значныя для ўсіх носьбітаў традыцыі, веданне якіх пазначае прыналежнасць да яе і якія ёсць ключы да самое традыцыі.

Усе гэтыя пытанні важныя для разумення сутнасці традыцыйнай культуры, яе пазіцыі і ролі ў рэгіёне і свеце, яе старажытнасці і суаднесенасці з культурамі мінулага. Гэта магчымасць прасачыць генеалогію культуры і, адпаведна, народа – яе творцы і захавальніка, а таксама пабачыць, як культурныя коды, сфарміраваныя ў народнай традыцыі, прасякаюць сабой і «высокую», аўтарскую творчую спадчыну. Літаратура, выяўленчае мастацтва, музыка выступаюць, часта неўсвядомлена, носьбітамі і выразнікамі гэтых кодаў, што праз сваю ўніверсальнасць, шматзначнасць, шматмернасць, эстэтычную і сэнсавую пазнавальнасць дапамагаюць рэалізацыі творчай задумы, а таксама выклікаюць эмацыйны водгук у свайго адрасата. Такім чынам, кампаратыўныя – інтра- і экстракультурныя – даследаванні традыцыйнага светамыслення даюць неацэнную магчымасць зазірнуць у часавую глыбіню і прасторавыя абсягі вялікага кантынууму ўсяе чалавечае культуры.



*Традыцыйная культура і аўтарскае мастацтва. Тытульны аркуш кнігі «Песня песняў» выдання Францішка Скарыны. Прага, 1518 г.*



*Сакральная сфера. Ілюстрацыя з Бібліі Васіля Кораня. Масква, 1692–1696 гг.*

Этнафіласофія пачынае выступаць у якасці самарэфлексіі культуры як комплекснага прадукта інтэлектуальнай, творчай, сацыяльна-нарматыўнай ды іншай дзейнасці супольнасці, які мае гістарычную працягласць і няспыннае развіццё і які ўкаранёны ў мінулым і скіраваны ў будучыню.

Аднак не менш важныя этнафіласофскія даследаванні для разумення культурнай і нацыянальнай ідэнтычнасці сучаснага грамадства, якое з'яўляецца спадкаемцам гэтай традыцыі. Праца з глыбіннымі сэнсамі традыцыйнай культуры дае магчымасць прасачыць іх развіццё, пэўную варыябельнасць, але пры гэтым – устойлівасць да сацыяльных змен і нават да гістарычных катаклізмаў, праз якія праходзіць грамадства. Сімвалы, вобразы, канцэпцыі традыцыйнай карціны свету захоўваюцца праз змены гістарычных эпох, хоць іх разуменне напаўняецца штораз новымі сэнсамі, рэалізуючы дыхатамію захавання і развіцця, устойлівасці і гнуткасці, кансерватыўнасці і варыябельнасці.

І вось калі ўвага даследчыка скіроўваецца на тое, як традыцыйнае светамысленне ўплывае на культурную ці нацыянальную ідэнтычнасць асобы або супольнасці, а таксама на суадносіны народнай і аўтарскай культуры, даследчык сутыкаецца з нечаканаю праблемай – неабходнасцю вывучэння, сістэматызацыі і канцэптуалізацыі жывой традыцыі, носьбітам якой ён з'яўляецца і сам. Як распазнаць і аддзяліць ад інтэлектуальнай працы ўласную эмацыйную заангажаванасць, ці магчыма наогул такое распазнаванне і аддзяленне і ці патрэбнае яно: ці не будзе яго вынік падобны на «даследаванні» Усходняга вучонага і Заходняга вучонага з п'есы Янкі Купалы «Тутэйшыя», якія вывучалі «тутэйшую» культуру, надаючы ёй рысы той культуры, з якой кожны з іх сябе атаясамліваў, не заўважаючы сваёй уласнай глыбіннай «тутэйшасці»? Даследчык так ці інакш працуе ў кантэксце сваёй культурнай традыцыі, якая абумоўлівае ягоны навуковы погляд і нават падыход. Але адна рэч – даследаваць традыцыю як завершанае цэлае, і зусім іншая – глядзець на яе як на адкрытую сістэму сувязей і сэнсаў у няспынным станаўленні, больш за тое – як на працэс, часткаю якога ёсць гэта самае тваё даследаванне, бо ў працэсе працы над ім ты фармулюеш, а значыцца, вызначаеш сэнсы і мадальнасці традыцыі. І тут пытанне этнафіласофіі як самарэфлексіі культуры набывае новае гучанне: суб'ект даследавання становіцца яго аб'ектам, у той час як апошні набывае пэўную суб'ектнасць.



*Канструяванне сэнсаў. Стварэнне жывёл і птушак. Ілюстрацыя Максіма Храпавіцкага да кнігі «Традыцыйны светалад беларусаў. Касмалогія». Мінск, 2023 г.*

Найлепш сувязь даследавання традыцыі і ўлучанасці ў традыцыю праяўляецца пры кантакце – навуковым і, так бы мовіць, жыццёвым – са сферай сакральнага, сэрцавінай ўсяе беларускае традыцыйнае сістэмы светамыслення. Распазнаванне і належнае стаўленне да сакральнага знаходзяцца ў самай аснове ідэнтычнасці традыцыйнай супольнасці. Уяўленні пра тое, як уладкаваная рэальнасць,– пра структуру свету, паходжанне і месца ў ім чалавека і супольнасці, працоўныя і святочныя цыклы, таямніцу нараджэння і смерці і сямейныя ролі, пра сувязь з продкамі, суадносіны бачнага і нябачнага планаў рэчаіснасці – маюць у сваёй аснове разуменне сакральнага, таго, што вынесенае за рамкі штодзённага, прафаннага жыцця, але пры гэтым вызначае рытмы і сэнсы гэтага жыцця, утвараючы для яго максімальна вялікі кантэкст – большы за асабісты свет, за сямейны і супольнасны, за ўвесь сусвет чалавечага досведу. Сакрумам поўніцца ўся ўяўляльная (тая, якую магчыма ўявіць) рэчаіснасць, ён яе тлумачыць, апраўдвае, абгрунтоўвае; ён іманентны рэчаіснасці, бо пастаянна прысутны ў свеце і жыцці, і адначасова трансцэндэнтны ёй – працінае яе і застаецца па-за ёю, непараўнана большы за штодзённы свет, як Бог у старажытнай рабіністычнай традыцыі, калі яму надаецца сакральнае імя *Макот* – מקום, што значыць «Месца», бо Бог і ёсць месца для ўсяго існага, змяшчаючы ўвесь сусвет (ці ўсе сусветы) ў сабе, пры гэтым застаючыся нязменным.

Уяўленні пра сакральнасць найбольш устойлівыя і жывучыя, нягледзячы на тое, што і асобныя складнікі сферы сакруму, і ўся сфера цалкам могуць мяняцца, пераасэнсоўвацца ў розныя эпохі, па-іншаму прачытвацца новымі пакаленнямі – у адпаведнасці

з новымі рэаліямі, калектыўнымі ведамі і патрэбамі часу.

Аднак гэта тычыцца не толькі традыцыйнага грамадства. Любая вялікая ўстойлівая сацыяльная структура, такая як нацыя, дзяржава або іншая вялікая супольнасць, мае ў цэнтры сваёй ідэнтычнасці сакралізаваныя сімвалы, іерархіі, адносіны, суаднясенне сябе з якімі становіцца індыкатарам прыналежнасці да супольнасці. У сучасным свеце сакральнасць гэтак жа важная для пачуцця прыналежнасці, як і ў традыцыйным грамадстве, хоць тут яна звычайна вынесеная за межы актуальнага светамыслення. Тым не менш людзі выконваюць належныя рытуалы на святы гадавога цыклу, у вызначальныя жыццёвыя моманты, у дачыненнях з продкамі і г.д. Што ёсць сакральным для таго ці іншага грамадства, якія з’явы, рэаліі, канцэпты, падзеі, персанажы яно надзяляе статусам сакральнасці – адказы на гэтыя пытанні найлепшым чынам характарызуюць гэтае грамадства. А жывая традыцыя сакральнасці вызначае ідэнтычнасць сваіх носьбітаў.

Па вялікім рахунку, народную традыцыю светамыслення немагчыма зразумець і асэнсаваць, гледзячы на яе звонку, але гэтак жа немагчыма і разгледзець яе знутры самое традыцыі. Звонку можна даследаваць шматлікія фальклорныя і этнаграфічныя палявыя ці акадэмічна апрацаваныя запісы, кожны з якіх расказвае пра свой фрагмент карціны свету, і карпатліва, дбайна збіраць фрагмент да фрагмента, параўноўваць іх, знаходзіць суадносіны ўнутры традыцыі і з навакольнымі традыцыямі, рэканструюючы максімальна вялікую, аб’ёмную сістэму светамыслення, яе цывілізацыйнае паходжанне і ролю. Але нельга звонку распазнаць тыя самыя культурныя коды, тыя няўлоўныя сэнсы, якія ўнікаюць дакладных вызначэнняў і ўцямных фармуляванняў, але вызначаюць распазнаванне ўсіх тонкіх, «капілярных» унутраных сувязей як у самой карціне свету, гэтак і паміж ёю і тымі, каму яна належыць,– ці, дакладней, тымі, чыё разуменне рэчаіснасці вызначаецца гэтай карцінаю свету.

Знутры ж традыцыі немагчыма яе асэнсаваць цалкам, як немагчыма рыбе ахапіць свядомасцю акіян. Знутры немагчыма ўсведамляць, што сэнсы – сакральныя ці прафанныя, касмалагічныя ці антрапалагічныя, рэлігійныя ці сацыяльныя – не само сабой зразумелая і неабходная дадзенасць, але што яны заўсёды канструююцца, бо належаць не сусвету, а карціне свету, не прыродзе рэчаў, а інтэрпрэтацыі рэчаіснасці. І не паўстае пытанне, кім, як і чаму яны канструююцца. Знутры бачныя толькі тыя сэнсы, якія знаходзяцца ў абсягу



*Канструяванне сэнсаў. Стварэнне зорак. Ілюстрацыя Максіма Храпавіцкага да кнігі «Традыцыйны светалад беларусаў. Касмалогія». Мінск, 2023 г.*

індывідуальнага або калектыўнага досведу, што рэалізоўваецца тут і цяпер, але не бачная ўся мярэжа ўзаемаабумоўленых элементаў і структур, з якіх складаецца карціна свету, не бачная рэлятыўнасць гэтай карціны ў дачыненні да яе іншых форм і версій, бо знутры гэтая карціна прайграецца, рэалізоўваецца экзістэнцыйна, і таму яна абсалютная ў кожным моманце сваёй рэалізацыі.

Адлегласць і незаангажаванасць – або набліжэнне і пагружэнне? Як здзейсніць этнафіласофскі выпыт? Аддзяліць сваё даследаванне традыцыі ад свайго пражывання яе ці паспрабаваць сумясціць? Глядзім на яе звонку, як на велізарную культурную спадчыну, акадэмічна апрацаваную, пачынаючы ад XIX ст., і адчуваем яе знутры як традыцыю, якая жыве сама і пражываецца намі. Разглядаем яе як самадастатковую з’яву – аб’ект, і як тое, што самаўзнаўляецца ў кожным пакаленні, кожнай эпосе, кожнай сям’і і ў кожным сваім носьбіце – суб’ект культуры. Мы самі як носьбіты традыцыі робімся аб’ектам даследавання, застаючыся яго суб’ектам. Вывучаючы сваю традыцыю, мы ўваходзім у складаныя і не да канца вызначаныя суб’ектна-аб’ектныя адносіны. І гэта дае нам магчымасць разумець не толькі вытокі, але і сутнасці сучаснай нацыянай супольнасці.